# Як спадабацца мужчыну «de luxe»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Ці існуе ўніверсальны стыль, які дапамагае дабіцца поспеху і ў кар'еры, і ў асабістым жыцці — і мужчынам і жанчынам?***

— Гэта класічны стыль. Але я адзначу, што для таго, каб «выспець» для класічнага стылю, чалавек павінен быць культурным, для якога этыкет — норма жыцця. Класічны стыль — гэта стыль элітарны. Толькі заможныя людзі могуць дазволіць сабе жыць у ім. Напрыклад, перад вамі менеджар — у дзелавым класічным касцюме і генеральны дырэктар — у дзелавым класічным касцюме. У іх аднолькавы ўзрост і нават колер гальштукаў. Як іх адрозніць? У чалавека, які стаіць вышэй на сацыяльнай лесвіцы, будзе максімальна дарагая тканіна касцюма. Вось таму мы і гаворым, што класічны стыль — дарагі.

***— Мы не ўзгадалі дзелавы стыль?***

— Не існуе дзелавога стылю. Ёсць **ДЗЕЛАВЫ КІРУНАК**. Гэта вынік адаптацыі класічнага стылю да офіса. Ён менш кансерватыўны, чым класічны.

***— Раскажыце, што ўваходзіць у паняцце самапрэзентацыі акрамя знешнасці?***

— Кампанентаў шмат. Мы вучым чалавека правільна хадзіць, стаяць, прысаджвацца, трымаць спіну, нават сядзець за сталом, правілам кантактавання (як стаць прыемным суразмоўцам). Усё гэта — неад'емныя складнікі паспяховай самапрэзентацыі.

***— Апошнім часам з'явілася шмат літаратуры на тэму, як стаць «сцервай». Што гэта за вобраз і наколькі насамрэч ён эфектыўны для дасягнення поспеху?***

— Сцерва — гэта стыль жыцця. Вышэйшы пілатаж для «сцервы» — гэта латэнтная сцерва (непраяўленая, схаваная). Знешне гэта мілавідная асоба, мяккая, ранімая, жаноцкая, падатлівая. А ўнутры — амбіцыйная, мэтанакіраваная, упэўненая ў сабе жанчына, якая ніколі не дазволіць таптаць сябе. Гэта не прыгажуня-пустышка, якая пасіўна чакае прынца, а жанчына, якая дакладна ведае, што ёй трэба ад жыцця і як гэта атрымаць. Ёсць і мужчынскі адпаведнік сцервы — сцярвятнік. Не дай вам Бог патрапіцца такому мужчыну. У адрозненне ад жанчыны-сцервы мужчына-сцярвятнік вельмі жорсткі, у яго не існуе ніякіх правілаў і нормаў паводзінаў, маралі. Ён у прынцыпе кантактуе з жанчынамі без асобага сэнсу. Для яго гэта спорт, які суправаджаецца выключнай жорсткасцю. Сцерва не такая, бо яна ў першую чаргу жанчына, а значыць, верыць у лепшае.

***— Калі ласка, назавіце асноўныя памылкі, якія перашкаджаюць людзям дасягаць поспеху.***

— Для таго, каб быць паспяховым, трэба мець гарманічны вобраз, быць гарманічным і звонку, і ўнутры. 95 працэнтаў людзей не ўпэўненыя ў сабе, а веды дапамагаюць гэта змяніць. Вы дакладна ведаеце, чаму вам пасуе гэта, а не тое, чаму вам можна насіць чорнае ці, наадварот, нельга. Я, напрыклад, упэўнена ў сабе на 100 працэнтаў і ведаю, што магу закахаць у сябе літаральна любога. Я нават ставіла адпаведны эксперымент: за 14 дзён прымусіла закахацца ў сябе маладога забяспечанага мужчыну. Праз 2 тыдні пасля знаёмства ён кінуў сваю дзяўчыну, з якой жыў 7 гадоў, падарыў мне пярсцёнак з брыльянтам і папрасіў рукі і сэрца... Галоўная ўмова поспеху і ў асабістым жыцці, і ў бізнэсе — упэўненасць у сваіх сілах.

***— Дайце параду, як жанчыне гарманізаваць сваё асабістае жыццё?***

— Жанчыне не трэба баяцца знаёміцца з мужчынамі. Толькі не варта шукаць мужчын у рэстаранах ці трэнажорных залах. Памятайце: калі мужчыну падабаецца жанчына, ён хвалюецца, а калі жанчыне падабаецца мужчына, яна нахабнічае. Не варта быць занадта назойлівай. Аднак і непрыступнай выглядаць не трэба — мужчыны гэта ненавідзяць. Увогуле, **правілы паводзінаў з рознымі мужчынамі розныя**. Калі гэта багаты мужчына — з ім трэба пагаджацца і падтрымліваць любую яго ідэю. Але калі вы з ім у кампаніі іншых багатых мужчын, ні ў якім разе не трэба смяяцца разам з астатнімі! Вы павінны быць натуральнай і смяяцца толькі тады, калі вам насамрэч весела. Такія мужчыны любяць упэўненых у сабе і незалежных жанчын. Калі вы хочаце заваяваць мужчыну «de luxe», у вас ніколі не павінна быць неаплачаных рахункаў, даўгоў, адключаным за няплату мабільны тэлефон. Мужчына падсвядома шукае жанчыну, якая стане маці яго дзяцей, і такая жанчына павінна быць адказнай. Багаты мужчына будзе вас ацэньваць усебакова — які ў вас узровень адукацыі, хто вашы бацькі, дзе вы раней працавалі, дзе жылі. Ён у вас пра гэта і пытацца не будзе, а самастойна ўсё высветліць.

Вельмі важна быць натуральнай — багатыя людзі цэняць прастату і шчырасць, хоць гэта зусім не азначае, што вам трэба агучваць усё, што прыйшло ў галаву. Безумоўна, ваша знешнасць мае вялікае значэнне, але, каб зацікавіць мужчыну «de luxe», жанчына, апроч іншага, павінна быць інтэлектуальнай і высокамаральнай. Яна — генафонд, і мужчына гэта падсвядома адчувае. Лепшы варыянт — калі вы знаёміцеся выпадкова (ва ўсялякім разе ён так павінен думаць). Тады кантактаванне праходзіць на роўных, вы быццам бы не ведаеце, што ён багаты, і зусім не мае значэння, што вы тры гадзіны курсіравалі вакол яго дома ў чаканні «выпадковай» сустрэчы.

***— А калі гаворка ідзе пра сярэднестатыстычнага мужчыну, не абцяжаранага значным золата-валютным запасам?..***

— Тут усё прасцей. Такія мужчыны ў першую чаргу «вядуцца» на знешнасць (як бы яны ні пераконвалі, што для іх вельмі важны духоўны складнік). Другое, што ім трэба падаваць гарачым, гэта сцвярджэнне, што вы — хатняя істота, нікуды не ходзіце і вам ніхто не цікавы, акрамя ЯГО. Абавязкова падкрэслівайце, што ён для вас — усё, што ён — ГЕРОЙ. Супакойце яго, што ў найбліжэйшы час не плануеце замужжа. І яшчэ вы павінны ўмець гатаваць. Вось і ўсё. Ён — ваш. Сярэднестатыстычны мужчына разумее, што знайсці сабе жанчыну з трыма дыпломамі аб вышэйшай адукацыі і знешнасцю мадэлі і забяспечваць яе патрабаванні ён не ў стане. Яму неабходна не надта патрабавальная жанчына, якая будзе надаваць яму ўпэўненасці.

***— Калі жанчына вышэй за мужчыну па ўзроўні адукацыі і сацыяльным статусе?..***

— ...то нічога не атрымаецца. Як бы ні кіпела кроў ад страсці, з часам такія адносіны вычарпаюць сябе.

***— Каб мужчыны не пакрыўдзіліся, давайце дадзім ім некалькі парад, як заваяваць сэрца жанчыны.***

— Свет не змяніўся. Самае галоўнае — гаварыце, якая яна **ПРЫГОЖАЯ**. Прычым трэба дэталізаваць: усхваляць асобныя часткі цела, рысы характару. Калі ў жанчыны крывыя ногі, кажыце ёй, якія ў яе **ШЫКОЎНЫЯ ФРАНЦУЗСКІЯ** ногі. Насамрэч, любая жанчына, нават самая непрыгожая, лічыць сябе прыгажуняй, хай сабе пакуль што і неацэненай.

Псіхолагі сцвярджаюць, што чалавек заўважае змяненне яркасці толькі калі яна павялічваецца ў 8 разоў. Адсюль парада і для мужчын, і для жанчын: хочаце заўсёды выглядаць ашаламляльна, надзвычайна, эфектна, чароўна? Падчас кожнай новай сустрэчы з каханым вы павінны быць у 8 разоў «ярчэй» (не паўтарацца ў адзенні, апранаць новыя рэчы, надаваць увагу прычосцы, аксесуарам і г.д.).

**Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.**

Школа юнкараў

# Чалавек на дошцы

**На маю думку, Беларусь здольная выхаваць сапраўдных, так бы мовіць, якасных, спартсменаў-экстрэмалаў. Нельга гэта губляць з поля зроку, паколькі экстрэмальны спорт імкліва ўварваўся нават у Алімпійскія гульні.**

На перспектывы развіцця нетрадыцыйных відаў спорту я вырашыў паглядзець вачыма майго сябра Пятра, які захапляецца скейтбордынгам.

Яшчэ не так даўно падлеткі гулялі ў футбол і хакей. Цяпер — становяцца на дошку з калёсікамі, каб рабіць усялякія выкрутасы... Пятро кажа, што скейтборд — гэта ў першую чаргу той від спорту, якім можна займацца нават пры адсутнасці супернікаў. Да таго ж, тут патрабуецца літаральна адна дошка, якую пачатковец можа набыць дзесьці ўсяго за 100 тысяч рублёў. Добры футбольны мяч каштуе, як вядома, каля 150 тысяч. Няма ў скейтбордынга і абмежаванняў па палавой прыкмеце: ім займаюцца як хлопцы, так і дзяўчаты, хоць першых, безумоўна, значна больш.

Паводле слоў Пятра, галоўнае, чаго нестае на сёння беларускім экстрэмалам, у прыватнасці, скейтбардыстам, дык гэта асобных пляцовак для трэніровак. Амаль для ўсіх вялікіх гарадоў Еўропы і Амерыкі такія пляцоўкі — звычайная з'ява. У Беларусі ж скейтарам давялося аблюбаваць грамадскія месцы, праезныя часткі і двары. Гэта, як правіла, не падабаецца ні навакольным, ні самім спартсменам. Крытая зала з вялікімі і доўгімі рампамі і дугамі — проста мара для Пеці і ягоных сяброў. Тым больш, скейтбордынг у адрозненне ад шахмат — траўматычны від спорту, а на крытай пляцоўцы дапамога заўсёды была б хуткай і якаснай.

Пеця мяркуе, што прафесіяналаў у гэтым відзе спорту няма. Ёсць, безумоўна, людзі, «апантаныя» сваёй дошкай, яны аддаюць любімаму занятку ўсё жыццё. Такіх сапраўды можна называць Майстрамі. Напрыклад, Тоні Хоўка і Бэм Марджэры даўно з'яўляюцца ўзорнымі для амерыканскіх і еўрапейскіх скейтараў. Апошнія стаялі ля вытокаў падобнага экстрыму, і сёння яны — прызнаныя заканадаўцы моды ў скейтбордынгу.

Што да таго, як жа ўпершыню стаць на дошку, то адназначнага адказу тут няма: у каго як атрымліваецца. Часцей за ўсё групка маладых людзей набывае скейты і пачынае... самастойную практыку. Тым больш, з інтэрнэту можна скапіяваць адпаведнае відэа з дэманстрацыяй пэўных рухаў. З часам можа надысці і майстэрства, пазней — першыя спаборніцтвы. А што з гэтым захапленнем рабіць далей — асабістая справа скейтара.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ, вучань СШ № 105 г. Мінска.**

# ТАНЦЫ ПАД СОУСАМ

**Гэты танец нарадзіўся пад сонечнымі промнямі Кубы. Тут важныя рытм і імправізацыя. Танцаваць яго можна і ў двухгадовым узросце і тады, калі табе за семдзясят.**



Гэты танец — сальса. Слова «сальса» ў перакладзе з іспанскай мовы азначае «соус». І сапраўды гэты танец — сумесь элементаў танцаў, кшталту румбы, мамбы і ча-ча-ча. Краінай паходжання сальсы лічыцца Куба. Танец нарадзіўся каля 30 гадоў таму. Але сваё актыўнае развіццё атрымаў у 1990-я. Менавіта тады і пачалася экспансія сальсы ў свеце. Пачалі з'яўляцца сальса-школы, праводзіцца сальса-фестывалі і спаборніцтвы. У снежні 2005 года ў Лас-Вегасе было праведзена першае ў свеце спаборніцтва па сальсе — World Salsa Championships. У Беларусі першыя ўрокі сальсы даваліся ў 2003-м. Цяпер у адным толькі Мінску налічваецца каля сямі буйных сальса-школ. У клубах праводзяцца спецыяльныя сальса-вечарыны, а з 2007 года два разы на год Мінск прымае фестываль па сальсе, які праводзіць сталічная сальса-школа SalsaBreez.

## Адзін мужчына на дваццаць дзяўчат

Папулярнасць сальсы ў Беларусі, на погляд дырэктара адной з сальса-школ Мінска Юліі Шапо, у тым, што ён вельмі просты і мае яркую энергетыку. Ці насамрэч сальса такі просты танец, ці можна яму навучыцца за дзень, я вырашыла высветліць на адкрытым майстар-класе.

У вялікую залу Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі на першы дзень майстар-класу прыйшло каля 20 чалавек. З іх толькі адзін невысокі чорнавалосы хлапец з невялічкім піўным жыватком. Аднак нават ён, верагодна, прыйшоў сюды не па сваёй волі. Каля яго круцілася такая ж невысокая дзяўчына. Яна пастаянна паварочвалася і падбадзёрвала яго падчас трэніроўкі.

**Дарэчы, заняткі сальсай — карысныя для сэрца, мышцаў жывата і агульнага тонусу арганізма. За адну гадзіну сальсы вы спальваеце каля 420 ккал.**

— Мужчыны — гэта праблема ў танцавальных школах, — уздыхнула высокая дзяўчына справа ад мяне. — Увогуле да танцаў яны ставяцца вельмі скептычна.

Сярод дзяўчат-удзельніц былі і студэнткі, прадаўцы, медыцынскія работнікі і школьныя настаўніцы.

Прычыны, па якіх дзяўчаты вырашылі прыйсці на майстар-клас, розныя. Некаму імпануе сонечная лаціна, хтосьці лічыць сальсу модным кірункам.

— Я, ведаеш, была нядаўна на Кубе, — расказвае худая жанчына з намаляванымі бровамі. — Ляжу, значыцца, на пляжы і гляджу, як людзі развучваюць сальсу. Ой, думаю, як проста. І не пайшла вучыцца. А ўвечары я прыходжу на дыскатэку, такая прыгажуня ва ўсім белым на высачэзных абцасах. І мяне запрашае на танец такі кубінскі мача. Ён пачынае танцаваць, а я... Карацей, я нават нагамі не змагла перабіраць. І мне так сорамна стала. Вось і вырашыла, што абавязкова навучуся танцаваць, як на Кубе.

## Сальсу можна танцаваць і ў два гады, і ў семдзясят

Сярэдні ўзрост удзельніц майстар-класа — каля 24—30 гадоў. Увогуле ж узроставых абмежаванняў для сальсы няма. Яе можна пачынаць развучваць і ў два гады, і ў семдзясят. Як расказваюць гардэробшчыцы, падчас аднаго з сальса-фестываляў ахова не прапускала старога ссівелага мужчыну, які хацеў патрапіць на танцы. Пасля высветлілася, што гэта выдатны майстар сальсы. І сканфужаныя ахоўнікі былі вымушаныя прасіць прабачэння. Аднак пажылых беларусаў у школах сальсы бачыць даводзіцца не часта.

— Асноўны ўзрост у нашай школе — больш за 20 гадоў, — кажа Юлія Шапо, арганізатар майстар-класа. — Ёсць і пары, каму за пяцьдзясят (але іх не так шмат), яны ўсе займаюцца ў адной групе.

Для сальсы абсалютна без розніцы ваша камплекцыя. Паўната ці худоба абсалютна не перашкаджаюць танцу. Няма супрацьпаказанняў па здароўі, сацыяльным статусе і колеры скуры. Перашкодзіць можа толькі нежаданне вучыцца.

## Галоўнае — рытм

Аснова сальсы — рытм. Базавы крок — левай нагой адступіць назад, пасля прыставіць правую, правай нагой уперад, пасля прыставіць левую. Аналагічна можна крочыць убок. Калі танцаваць сальсу ў пары, то жанчына цалкам давярае мужчыну.

— Сальса — непрадказальны танец. Дзяўчына ніколі не ведае, што з ёй адбудзецца ў наступную хвіліну. У адрозненне ад бальных танцаў, дзе кожны ведае сваю партыю, у сальсе ўсё заснавана на ўзаемных імпульсах і адчуваннях, — расказвае Юлія Шапо.

Юля паказала рухі плячыма ўправа, улева і па коле. І ўжо праз хвіліну мы пачалі спрабаваць паўнавартасна танцаваць адзін элемент. Рыжавалосая дзяўчына, што стаяла перада мной, упэўнена паўтарыла ўсё з першага разу, хударлявая жанчына з намаляванымі бровамі ўвесь час блыталася. Адзіны наш мужчына таксама мужна капіяваў рухі трэнера. У яго атрымоўвалася горш за ўсіх.

— Мужчыны спачатку адстаюць ад дзяўчат, — падбадзёрыла яго трэнер. — Але пасля яны наганяюць і нават пераганяюць іх.

Калі развучвалі элементы паасобку, я здзіўлялася лёгкасці і прастаце, з якой яны мне даюцца. Аднак тэмп павялічыўся і патрэбна было сумясціць рухі рукамі і нагамі, вось тут мой вестыбулярны апарат ніяк не хацеў працаваць. Але пасля гадзіны паўтораў адзін элемент засвоілі ўсе, нават хлопец.

## Асвоіць танец можна і самастойна

— Ты ведаеш, мне падаецца, што нават пасля першай гадзіны заняткаў я ўжо магу ісці танцаваць. — падчас дзесяціхвіліннага перапынку кажа дзяўчына з намаляванымі бровамі. — Усё, як толькі навучуся танцаваць сальсу, адразу паеду на Кубу.

Прызнаюся шчыра, за адзін майстар-клас я навучылася двум базавым элементам. Аднак, на маё здзіўленне, нават гэтага дастаткова, каб ужо ісці на сальса-вечарыну і ўдасканальваць свае ўменні.

Пры вялікім жаданні і адсутнасці ў вашым горадзе ці вёсцы заняткаў па сальсе, можна навучыцца ёй самастойна. У інтэрнэце ёсць спецыяльныя відэаролікі, па якіх можна засвоіць базавыя элементы сальсы.

Лацінаамерыканская энергетыка, гэтыя сонца і музыка, якая падабаецца ўсім і аб'ядноўвае культуры. Сальса карысная для душэўнага здароўя. Танцуе і адпачывае душа, вось што самае важнае. Можна, вядома ж, схадзіць у кіно і наведаць тэатр, аднак, гэта ўсё нейкі аднастайны від адпачынку. У сальсе ж кожны раз адкрываецца нешта новае, тут проста мора цікавых людзей, сярод якіх можна знайсці сапраўдных сяброў. Танчыце сальсу і вы ніколі не будзеце адзінокімі.

**Настасся ЗАНЬКО.**

# Беларускія разумнікі і разумніца

*У беларускім пяціборстве перамагла бабруйская гімназістка Насця ЖЫРКЕВІЧ*

Беларускае пяціборства — гэта алімпіяда для школьнікаў Магілёўскай вобласці, якая сёлета праходзіла ў абласным цэнтры 9-м разам. Адметнасць яе ў тым, што заданні па матэматыцы, беларускай мове і літаратуры, гісторыі Беларусі і прыродазнаўстве ўдзельнікі выконваюць на беларускай мове.

На пяціборства Магілёўская арганізацыя Таварыства беларускай мовы і Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт запрашаюць лепшых вучняў старэйшых класаў. Сёлета прыехалі 36 чалавек.

**Мікіта Каламійчанка, вучань школы № 5 Магілёва,** упершыню ў беларускім пяціборстве набраў максімальную колькасць балаў за заданне па гісторыі Беларусі. Малады чалавек займаецца ў рыцарскім клубе, захапляецца гісторыяй рыцарства.

— Гісторыя сваёй краіны — гэта як гісторыя сям'і, — сказаў на ўзнагароджанні **настаўнік матэматыкі, кіраўнік аргкамітэта беларускага пяціборства Міхась Булавацкі**. — Трэба вывучаць гісторыю Беларусі і па літаратурных творах. Сёлета заданні па беларускай літаратуры на нашым пяціборстве мы прысвяцілі Уладзіміру Караткевічу ў сувязі з яго 80-гадовым юбілеем.

Найлепш на пытанні па беларускай літаратуры адказаў **вучань ліцэя № 3 Магілёва Юрась Ананіч**. Нават нягледзячы на тое, што малады чалавек вучыцца ў класе з эканамічным ухілам.

Трэцяе месца ў пяціборстве заняў **вучань школы № 2 горада Чавусы Віталь Верашчага**, другое — **вучань 3-га магілёўскага ліцэя жыхар Бялынічаў Зміцер Клепча**.

Усе маладыя людзі з ліку пераможцаў — вучні 9—11 класаў. 1-е месца заняла ў пяціборстве дзяўчына, **вучаніца 8-га класа бабруйскай гімназіі № 3 Насця Жыркевіч.** Яна найперш падзякавала арганізатарам пяціборства за магчымасць гутарыць на беларускай мове.

— Я люблю беларускую мову і ганаруся сваёй Беларуссю, — усміхалася дзяўчына.

Насці 13 гадоў, яна хоча ў будучыні вывучаць міжнародную эканоміку. Але гэта зусім не перашкаджае бабруйскай школьніцы цікавіцца беларускай і іншымі славянскімі мовамі. Шырокі ўжытак роднай мовы падтрымлівае маці Насці Алена Юр'еўна.

— Мы робім у нашай сям'і тыдні беларускай мовы, — паведаміла маці. — І нават малодшая дачка, 10-гадовая Ангеліна, падтрымлівае нас. У нашай сям'і родная мова ў пашане.

— Мы чакаем ва ўніверсітэце такіх здольных вучняў, як Насця Жыркевіч і іншыя пераможцы беларускага пяціборства, — сказаў **дэкан педагагічнага факультэта Аляксей Лаўшук**. — Наша алімпіяда павялічвае цікавасць да роднай мовы ў школьнікаў. Нездарма ўсё больш выпускнікоў здаюць тэсты менавіта на беларускай мове.

**Ілона ІВАНОВА.**

# РАДАВЫ — ГЕНЕРАЛ

У Віцебску прайшлі гарадскія ваенна-спартыўныя спаборніцтвы «Гонар мундзіра». У іх узялі ўдзел каманды салдатаў тэрміновай службы, школьнікаў, гімназістаў, навучэнцаў пазашкольных устаноў.

Каманды падрыхтавалі свае «візітныя карткі», паўдзельнічалі ў конкурсе асілкаў, у эстафетах. Апошняя мела назву «радавы — генерал». Турнір арганізаваў гарадскі камітэт БРСМ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# БЕЛАРУСКІЯ РЫЦАРЫ ПАЕДУЦЬ НА «БІТВУ НАЦЫЙ»

Міжнародны праект «Бітва нацый» упершыню пройдзе 30 красавіка—3 мая ва Украіне ў Хацінскай крэпасці X—XVIII стагоддзяў: у гэтым фестывалі гістарычнай рэканструкцыі і гістарычнага фехтавання возьмуць удзел найлепшыя байцы з Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы. Для таго, каб вызначыць, хто ж варты ўвайсці ў нацыянальныя зборныя, пройдуць адборачныя турніры — у Беларусі, прынамсі, пяцьдзясят самых дастойных рыцараў будуць адабраныя падчас фестывалю «Меч храма», які мусіць прайсці ў Мінскім палацы дзяцей і моладзі 12-14 сакавіка. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі **Іван КРАЎЦЭВІЧ, капітан нацыянальнай зборнай Беларусі па гістарычным фехтаванні**. Ён жа адзначыў, што беларускія хлопцы традыцыйна лічацца сур'ёзнымі байцамі, а таксама што ўжо распрацаваныя ўніфікаваныя даспехі для беларускай зборнай: адзенне паверх даспехаў сіняга колеру, а на шчытах — выява белага зубра *(на здымку)*.

— «Бітва нацый» — гэта праект, які будзе праходзіць прыкладна раз на квартал у розных краінах. Мы пачынаем ва Украіне, а потым гэта можа быць і Польшча, і Расія, і Беларусь, — лічыць **Антон ТРУБНІКАЎ, прадстаўнік аргкамітэта «Бітвы нацый» ад Украіны**. — Гэта агульная справа, бо ў нашых краін багатая сярэднявечная гісторыя, а нашы дзеці не заўсёды яе добра ведаюць. Ды што казаць, я сутыкаўся з тым, што некаторыя настаўнікі ва Украіне вельмі цьмяна ўяўляюць, што адбывалася на тэрыторыі Кіеўскай Русі і Вялікага Княства Літоўскага... А дзеці, асабліва ў XXI стагоддзі, усё ўспрымаюць праз малюнак і без візуалізацыі навязаць дзіцяці штосьці вельмі цяжка. І калі ён на свае вочы пабачыць рыцараў, калі зможа ўсё памацаць, адчуць дух сярэднявечча, то я лічу, гэта будзе лепшы сродак, каб прывіць любоў да гісторыі. А калі будзе любоў да гісторыі, будзе моцная любая нацыя.

Іван Краўцэвіч таксама лічыць, што рух рэканструкцыі — вельмі важны для выхавання моладзі:

— Большасць удзельнікаў рыцарскіх клубаў — гэта моладзь. Такім чынам маладыя людзі ўцягнуты ў вывучэнне гісторыі, прыкладную творчасць, выраб даспехаў і касцюмаў. Ну а каб удзельнічаць у паядынках, трэба мець добрую фізічную падрыхтоўку — такім чынам сур'ёзная ўвага надаецца спорту.

— Я, як прадстаўнік аднаго з клубаў, магу сказаць, што для нас падтрымка — гэта тое, што мы знаходзімся ў Мінскім палацы дзяцей і моладзі і што нам даюць магчымасць тут працаваць і займацца, за што вялікі дзякуй адміністрацыі палаца, — гаворыць Іван Краўцэвіч. — А вось што датычыцца глабальнай падтрымкі, то яе, на жаль, няма.

Дарэчы, па словах Івана Краўцэвіча, рух гістарычнай рэканструкцыі ў Беларусі пачынаўся з невялікай колькасці людзей, а цяпер перарос у з'яву больш масавую — сёння гэтым займаюцца некалькі соцень людзей і дзейнічае каля 20 ваенна-гістарычных клубаў:

— Калі ўсе прадметы раней ствараліся па ўласным уяўленні і па кадрах з нейкіх мастацкіх фільмаў, то сёння ўся амуніцыя і іншыя прадметы робяцца з гістарычнай дакладнасцю і, можна сказаць, самі амаль што музейныя экспанаты.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**



Пакаленне next

# РОЗНАЕ Ў АДНОЛЬКАВЫХ



Наша сённяшняе быццё настолькі перанасычана ўсялякімі поглядамі, думкамі, тэорыямі, якія так ці інакш уздзейнічаюць на ўнутранае «Я» і тым самым прыводзяць да пэўных пераўтварэнняў. Прычым адбываюцца яны не столькі ўнутры асобы, колькі ў знешнасці, праяўляючыся ў самых розных стылях і напрамках. Некалі і нашы бацькі перажывалі часы, калі наогул стыль жыцця змяняўся ў залежнасці ад модных тэндэнцый: музыка, кіно, мастацтва... А як яно цяпер? Што ад чаго залежыць? Сучасная моладзь розная, прычым не толькі па знешнім выглядзе, але і па стаўленні да жыцця таксама. Вось толькі не зразумела, што на што і ў якой ступені ўздзейнічае. На практыцы не заўсёды бывае так, што, напрыклад, стыль адзення супадае з характарам чалавека. А часам яны настолькі цесна пераплятаюцца, што аддзяліць адно ад другога проста немагчыма.

Якая ж яна, сучасная моладзь? На якія змены (і знешнія, і ўнутраныя) яна можа пайсці, каб дасягнуць гармоніі існавання сваіх цела і душы? Мне падаецца, што кожнаму з нас даводзілася бачыць так званых «эма» ці «нефармалаў», якія, на першы погляд, наўрад ці выклікалі сімпатыю. Хутчэй, наадварот. Людзі старэйшага ўзросту не могуць часам зразумець, што сваім знешнім выглядам хоча выказаць падлетак і наогул, да чаго імкнецца. Хоць у маладосці самі паводзілі сябе амаль гэтак жа. Толькі формы выяўлення і праяўлення былі трохі іншымі. Змяніліся толькі спосабы. Але ж ад перамены месцаў складаемых сума не мяняецца.

Мая суседка па пакоі належыць да так званых «нефармалаў». Праўда, разабрацца, каго сёння адносяць да гэтай групы моладзі, цяжка. Адны сюды прыпісваюць людзей, якія слухаюць цяжкую музыку, тыпу «метал», «рок» і гэтак далей. З натоўпу іх можна выдзеліць па знешнім выглядзе. А другія сюды адносяць яшчэ і тых, хто слухае «рэп» ці «R&B», напрыклад. Субкультура ёсць субкультура, і нікуды ад яе не схаваешся. Усе сучасныя модныя тэндэнцыі знайшлі свой адбітак.

## Нефармалы...

Хто гэта? Хлопцы і дзяўчаты, якія носяць доўгія валасы і адзенне чорнага колеру з выявамі касцей, чарапоў, розных жудасных пачвар і слухаюць музыку, ад якой у іншых моцна баляць вушы? Ці, можа, людзі, якія маюць высокі эстэтычны густ, бо разумеюць мастацтва, якое іншым не даспадобы з-за іх цемры і невуцтва?

Шчыра кажучы, раней я не разумела гэтых людзей. Мне падавалася, што для таго, каб захапляцца нейкім відам мастацтва, зусім не трэба праяўляць гэтыя захапленні шляхам змены свайго знешняга выгляду. Чорны колер, чарапы, доўгія валасы і нейкі, на першы погляд, дзікі выгляд рабілі іх для мяне не зусім прывабнымі. Падавалася, што акрамя сваёй музыкі яны нічога больш не ведаюць і наогул ні з кім не размаўляюць, акрамя сваіх. Але пасля, калі жыццё мяне звязала бліжэй з гэтымі людзьмі, я зразумела, наколькі павярхоўна і няправільна я разважала. Цяпер такі «нефармал» жыве са мною ў адным пакоі ў студэнцкім інтэрнаце, і мне падабаецца не толькі стыль яе адзення, але і тып мыслення. Лёля — готка, і ўсё ў яе знешнім выглядзе нагадвае пра гэта: чорны колер адзення, сцілы (абутак), дзіўныя колцы ў форме чарапоў, адпаведны макіяж з пераважнай чорнай падводкай. Спачатку мне здавалася, што яна будзе замкнёнай і агрэсіўнай, паколькі мы не разумеем яе музыкі, а тым больш акружэння. Але мае здагадкі аказаліся памылковымі. Лёля адразу раскрылася для кантакту, нават сама першай на яго пайшла. Нешта з яе музыкі падабаецца і мне. Мяне адразу ўразіў узровень яе інтэлекту і тып тэмпераменту. Дзяўчына шмат ведае з гісторыі і культуры не толькі нашай краіны, але і замежжа. А весялосць яе амаль што не пакідае. Пры гэтым у яе заўсёды свой пункт погляду, яна можа абгрунтаваць сваю пазіцыю. Здараецца, праўда, часам пачуць ад яе выказванні тыпу «А я не хачу і не буду!» ці «Адчапіся! Ты нічога не разумееш!».

Як расказала мне Лёля, нефармалы бываюць розныя. Вось яна — готка, і ёй падабаецца адпаведная музыка, якая мне нагадвае народныя матывы. Яна шмат гаворыць пра смерць і факт яе існавання яе ніколечкі не пужае. А ёсць яшчэ «металісты» — людзі, якія слухаюць надта цяжкую музыку — метал. Лёля дала мне паслухаць некалькі кампазіцый, у якіх я для сябе сэнсу не знайшла. Надта цяжка і часам незразумела. Яны таксама аддаюць перавагу чорнаму колеру, нават пазногці фарбуюць адпаведна. Ёсць яшчэ «панкі», аб субкультуры якіх я наогул зразумела толькі тое, што яны такія ёсць.

Аказваецца, усе яны не проста слухаюць сваю музыку недзе там, дома. У «нефармалаў» ёсць месца, дзе яны звычайна ўсе збіраюцца і бавяць час — «алейка». Нават маразы іх не пужаюць. І, гледзячы на Лёлю, я магу зрабіць выснову, што праходзяць такія сходы даволі весела і карысна: яны абменьваюцца навінамі з музычнай сферы, гуляюць у розныя гульні, гутараць на актуальныя тэмы... Такія пасяджэнні для нефармалаў — самае прыемнае баўленне часу.

## Эма...

**Іх таксама, як і рэпераў, адносяць да нефармалаў. Але калі наконт апошніх, яшчэ можна падумаць, то эма свой статус замацавалі надзейна. Праўда, металісты, готы і іншыя да эма ставяцца скептычна. Мая сяброўка Алена** раптам вырашыла змяніцца, і цяпер яна **Элен**. Чорны колер адзення ўперамешку з ружовым ці радзей чырвоным — тое, што адразу ж выдзяляе яе з натоўпу. А пра паводзіны дык і наогул можна не казаць: сентыментальнасць прысутнічае амаль што ўсюды. Праўда, настрой змяняецца даволі хутка, таму плаксіва-рымзлівы стан раптам можа змяніцца баявымі дзеяннямі. Таму я сто разоў падумаю, перш чым нешта ёй сказаць. У прадстаўнікоў гэтай субкультуры свая філасофія жыцця, супярэчыць якой — не заўсёды самы аптымальны варыянт. Ды і думкі яны выказваюць часам даволі слушныя і цікавыя.

## Калбасёр...

**Клабер** — чалавек, які амаль што ўсё сваё жыццё затрачвае на клубы, вечарыны. Ён заўсёды ў курсе ўсіх навінаў начнога жыцця, якое дае яму бясплатныя білеты на свае «тусы». Такія людзі звычайна не плацяць за ўваход на начную дыскатэку, паколькі лічацца пастаяннымі наведвальнікамі і маюць пэўныя карткі ці льготы. Праўда, і клаберы бываюць розныя.

**Гламурныя** — тыя, што затрачваюць шмат часу на падрыхтоўку свайго знешняга выгляду да чарговай вечарыны і не шкадуюць грошай на дарагое, фірменнае адзенне і касметыку. Звычайна ў іх сваё кола зносінаў, парушыць межы якога могуць толькі самыя-самыя. Яны прыцягваюць увагу не пластыкай руху на танцполе, а позіркам і стаўленнем да навакольных. Хтосьці іх ненавідзіць, а некаму хочацца быць да іх падобнымі.

**Калбасёры** — пастаянныя наведвальнікі пэўнага начнога клуба, якія ўмеюць працаваць над сваім стылем. Праўда, не толькі адзення і касметыкі, але яшчэ і танца. Такія людзі ўжо адпрацавалі за час наведвання пэўнай начной установы свае рухі, а пластыка адшліфавалася проста да ідэалу. Ад гламурных іх адрознівае адкрытасць: амаль што ўсіх, хто прыйшоў да іх з мірам і сяброўствам, яны гатовыя прыняць у сваю «тусу». Галоўнае — заўсёды быць шчырым і адкрытым да новых знаёмстваў. Гэтыя людзі — скарбонка клуба, паколькі шмат памятаюць і многім могуць падзяліцца з «маладымі» клаберамі. Менавіта такі шчыры і адкрыты чалавек — **Крысціна**. З ёй мы пазнаёміліся ў начным клубе, які мне давялося наведаць першы раз. Я — таксама клабер, і даволі часта адпачываю ў адным і тым жа клубе. Але часам хочацца выйсці некуды за межы. Менавіта там я і пазнаёмілася з Крысцінай, якая не дазволіла мне згубіцца на новым месцы. Яна адразу расказала мне, што ўжо 5 гадоў адпачывае менавіта тут, таму ведае ўсіх і ўсё. Крысціна пазнаёміла мяне са сваёй кампаніяй, якая падзялілася са мною многімі сваімі хітрыкамі. Гэтыя людзі звычайна шмат разумеюць у музыкальных стылях і маюць сваіх фаварытаў сярод іх.

## Розныя, але падобныя...

Адрозненне клабераў ад нефармалаў ці эма відавочнае — музыка і стыль: жыцця, адзення, характараў. Але і агульнае таксама можна заўважыць: усе яны сочаць за музыкай, адчуваюць яе, пры гэтым добра арыентуюцца ў псіхалогіі, гісторыі і іншых навуках. Яны маюць звод правілаў, кожны свае, і стараюцца змагацца за сваё месца ў грамадстве. У іх ёсць прыхільнікі і іншыя. Але ўсе яны — маладыя і імкнуцца да развіцця. Толькі спосабы для самавыяўлення ў кожнага свае.

**Падобнае ў розных спрабавала знайсці студэнтка БДПУ імя М.Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.**

# Члены івянецкага аддзялення СПБ абураны спробамі Т. Собаль і А. Борыс уцягнуць членаў саюза ў палітычныя разборкі

**ЧЛЕНЫ івянецкага аддзялення Саюза палякаў на Беларусі абураны спробамі Тэрэзы Собаль і Анжэлікі Борыс уцягнуць членаў саюза ў палітычныя разборкі. Аб гэтым гаворыцца ў звароце, падпісаным больш як 20 жыхарамі гарадскога пасёлка Івянец — членамі СПБ. Дакумент накіраваны ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства замежных спраў Беларусі, Упаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, у Мінскі абласны выканаўчы камітэт, паслу Польшчы ў Беларусі, у Міністэрства замежных спраў Польшчы і грамадскую арганізацыю «Вспульнота Польска», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Дом польскі павінен займацца культурна-асветнай работай, а атрымліваецца так, што разам з Анжэлікай Борыс яна (былы старшыня івянецкага аддзялення СПБ Тэрэза Собаль. — **Заўвага БЕЛТА**) уцягвае ўсіх членаў саюза ў палітычныя разборкі. Мы не хочам гэтага. Мы вельмі жадаем захаваць у Івянцы Дом польскі, польскую культуру, гісторыю Польшчы і Івянца. І думаем, што вы нам хоць крыху дапаможаце», — гаворыцца ў звароце.

Жыхары Івянца расказваюць, што яны прымалі актыўны ўдзел у стварэнні аддзялення СПБ у Івянцы. Выбраўшы на пасаду кіраўніка Тэрэзу Собаль, яны лічылі, што яна апраўдае іх давер. Спачатку так і было: члены саюза часта збіраліся, спявалі песні, танцавалі, праводзілі сходы, вырашалі розныя праблемы, добраўрадкоўвалі Дом польскі. Але пасля, канстатуюць члены івянецкага аддзялення СПБ, сітуацыя кардынальна змянілася. «Апошнім часам мы нічога не можам. Не ведаем, што адбылося з нашай пані кіраўніцай, — растлумачваецца ў звароце. — Мы не збіраемся, не праводзім сходы, не ведаем, што наогул адбываецца ў Доме польскім. Пані Тэрэза запрашае на сустрэчы выбраных асобаў. Пра старых палякаў яна забыла. Для яе сяброў ёсць усё, а простыя палякі забыты. Тэрэза груба ставіцца да людзей, і не кожны паляк можа зайсці ў Дом польскі».

У звароце таксама гаворыцца, што ў сваёй рабоце яна (Тэрэза Собаль. — **Заўвага БЕЛТА**) мае толькі асабістыя карыслівыя інтарэсы, для сябе і сваіх сваякоў. «Мы ведаем, што шмат разоў прыходзіла гуманітарная дапамога, якую яна дзяліла паміж сваімі блізкімі. Людзі, якім яна сапраўды патрэбна, не атрымлівалі нічога. Мы не ведаем, куды ідуць грошы, якія атрымліваюць за арэнду памяшканняў Дома польскага. Толькі добра ведаем аб шыкоўных кватэрах яе дзяцей у Мінску і за чый кошт яна ездзіць у Амерыку. На запрашэнні ў Польшчу яна бярэ сваіх родных, сяброў, але не тых, хто дапамагаў ствараць саюз палякаў у Івянцы», — адзначаюць члены Івянецкага аддзялення СПБ.

«Мы лічым, што Дом польскі створаны для нас, палякаў, а не для яе радні і сяброў. Мы не хочам больш цярпець знявагу і ўніжэнні з яе боку. Нам надакучыла выслухоўваць пагрозы ад яе ў свой адрас. Мы стаміліся ад яе неўраўнаважаных паводзінаў, яе хітрасці і плётак, — гаворыцца ў звароце. — Мы неаднаразова (у пісьмовай і вуснай форме) звярталіся ў консульства Рэспублікі Польшча ў Беларусі, чакаючы падтрымкі і разумення, але ніякага адказу на нашы звароты мы не атрымалі».

«Мы хочам, каб нашы дзеці, унукі і праўнукі захавалі сваю культуру, самабытнасць, заставаліся палякамі ў Беларусі, каб была дружба паміж Польшчай і Івянцом, таму просім выслухаць і прыняць пад увагу і наш пункт гледжання, і пажаданні нас, простых палякаў з Івянца, праанаалізаваць усе падзеі не толькі з падачы Анжэлікі Борыс і зрабіць правільныя высновы», — гаворыцца ў звароце.

# ДОМУ 110 ГАДОЎ. ЖЫЦЬ НЕЛЬГА. А ДЗЕ?

Зварот у карпункт

**ІНВАЛІД другой групы Ірына Алісейка жыве ў Віцебску на вуліцы Віцебскай у доме № 9, у паўразбуранай будыніне, якой ажно 110 гадоў. Жыве, нягледзячы на тое, што чыноўнікі прызналі дом непрыдатным для пражывання. Але атрымаць новае жыллё ў інваліда і яе сына не атрымліваецца. Чаму ў замкнёнае жыццёвае кола трапіла сям'я, — высветліў карэспандэнт «Звязды».**
**У гэта адразу і не паверыш. Няўжо насамрэч заканадаўствам не прадугледжана дапамога ў такіх выпадках? Пра такі стары дом і праблемы тых, хто не можа перасяліцца з яго, стала вядома, калі ў карэспандэнцкі пункт «Звязды» па Віцебскай вобласці звярнуўся па падтрымку і разуменне чалавек, які сябруе з сынам гэтай няшчаснай жанчыны — Андрэем. Кірыл як можа дапамагае вырашыць бедалагам жыллёвае пытанне.**



**ДОМ ПАБУДАВАНЫ Ў 1900-м**

Ірына нарадзілася ў 1960 годзе. Яе бацькі ўжо тады жылі ў гэтым драўляным доме № 9. А потым — і сын разам з ёй. Дом належыць цётцы Ірыны, якая ў далёкім 1959-м паехала ў Магаданскі край на пастаяннае месца жыхарства.

Гадоў пяць таму дом настолькі разбурыўся, што рамантаваць яго было, як кажуць, сабе даражэй. Ды і за якія грошы? Пенсія па інваліднасці малая. Нават на дробны рамонт патраціцца цяжка.

У доме і раней было вельмі вільготна. А тут наогул стала жыць праблематычна. Тым больш інваліду-астматыку. Суседзі параілі цяжкахворай жанчыне звярнуцца па дапамогу да ўладаў.

Ірына напісала ліст у Віцебскі гарвыканкам з просьбай забяспечыць жыллём сацыяльнага карыстання. Атрымала адмову. Як ёй растлумачылі, на падставе таго, што, згодна з патрабаваннямі заканадаўства, права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду маюць грамадзяне, якія стаяць на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Мяркуючы па колькасці лістоў, перапіска Ірыны Алісейкі з адказнымі асобамі была доўгай. Аўтар гэтых радкоў амаль што заблытаўся, чытаючы некаторыя.

Вось, напрыклад. Згодна з рэспубліканскім палажэннем аб парадку ўліку грамадзян, тымі, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прызнаюцца (далей цытата ў перакладзе з рускай мовы): «у тым ліку грамадзяне, якія пражываюць у жылым памяшканні, прызнаным не адпаведным санітарным і тэхнічным нормам...»

Згодна з зацверджаным рашэннем (№1081 ад 01. 11. 2005) Віцебскага гарвыканкама, права падачы заявы на абследаванне жылога дома або жылога памяшкання даецца выключна ўласніку жылога дома.

Але ж пасля ўваходжання ў сілу Указа Прэзідэнта (№ 152 ад 16.03.2006) стала магчымым, каб заяву маглі падаць і асобы, якія маюць права карыстацца жылым памяшканнем. Чаму тады не былі ўнесеныя адпаведныя карэктывы ў «нарматывы» гарвыканкама? — здзіўляецца інвалід.

І добра, што ў жніўні 2006-га чыноўнікі з адміністрацыі раёна абследавалі стан дома. Дом № 9 па вуліцы Віцебскай быў прызнаны непрыдатным для пражывання (аднесены да адпаведнай катэгорыі).

**А НЕ ЎСЁ ТАК ПРОСТА**

Быццам бы жыллёвае пытанне магло б пасля гэтага вырашыцца станоўча. Ды не. Як потым адказны работнік адміністрацыі растлумачыў інваліду, нават узгаданы акт склалі ў парушэнне вышэйназванага рашэння гарвыканкама. Акт прызнання дома нежылым прызналі «несапраўдным». Але ж у выніку на ўлік на паляпшэнне жыллёвых умоў Ірыну паставілі.

Тады яна пісьмова папрасіла гарвыканкам забяспечыць жыллём сацыяльнага карыстання. З надзеяй, што абыдзецца без валакіты. Адмовілі. Бо яе пенсія перавышае бюджэт пражытковага мінімуму (памер яе пенсіі складае 320 тысяч рублёў). А сацыяльнае жыллё толькі для тых, хто, у прыватнасці, атрымлівае пенсію па мінімуму.

Афіцыйныя асобы прапанавалі рашыць пытанне аб набыцці праблемнага дома ва ўласнасць для магчымасці атрымання пасля гэтага льготнага крэдыту і субсідыі на будаўніцтва кватэры. Маўляў, ільготы прадугледжаны толькі ўласнікам.

Не буду стамляць чытачоў усімі далейшымі нюансамі перапіскі.

Паколькі насамрэч Ірына не ўласнік дома, спрабавала па-добраму дамовіцца з уласніцай. Аказалася, што яе цётка жыве цяпер у расійскім горадзе Дзімітраў. Паводле слоў Ірыны, усе просьбы ўвайсці ў сітуацыю аказаліся безвыніковымі.

Цётка растлумачыла ёй «стан спраў». Маўляў, летась я падарыла дом сыну, які жыве ў Маскве. Ірына звязалася і з ім. А ён у адказ пра тое, што дом не збіраецца аднаўляць у найбліжэйшы час, таму што пераязджаць з Масквы ў Беларусь пакуль што не плануе.

Вось такая жыллёвая гісторыя. Адразу хочацца адзначыць, што журналіст — не юрыст. І, безумоўна, не можа добра арыентавацца ва ўсіх дробных пытаннях заканадаўства. І хай не крыўдзяцца афіцыйныя асобы з гарвыканкама. Упэўнены, што дзейнічалі яны па інструкцыі.

Шчыра шкада жанчыну з праблемамі здароўя. Што ёй рабіць? Як далей жыць у доме, які можа літаральна разбурыцца?

Ірына адправіла ліст на імя старшыні Віцебскага аблвыканкама. Адтуль ліст накіравалі для разгляду ў Віцебскі гарвыканкам. Як адзначыла Ірына, у адказе, які яна атрымала, зноў агульныя фразы, цытаты з нарматыўных актаў. Яна палічыла ліст чарговай адпіскай.

Упэўнены, неабходна адказным асобам зноў разабрацца з канкрэтным прыватным выпадкам. Няўжо адна Ірына ў краіне апынулася ў такой складанай і заблытанай сітуацыі?

Цяпер жанчына спадзяецца, што пасля асабістага прыёму ў губернатара зможа ўрэшце атрымаць рэальную дапамогу ад мясцовых уладаў.

Напрыканцы. Палова дома фактычна абрушылася, што вельмі добра бачна на фотаздымку, і рэальна пагражае жыццю. Ірына на момант падрыхтоўкі гэтага артыкула ў другі раз за месяц трапіла ў бальніцу...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Сяргея САВЕЛЬЕВА.**

Ведай нашых!

# Віктар КАЗЬКО: «У НАС БОЛЬШ ПАПУЛЯРНЫЯ КОНКУРСЫ СЯРОД МАДЭЛЬЕРАЎ, ЧЫМ СЯРОД ПІСЬМЕННІКАЎ...»

**3 сакавіка — Міжнародны дзень пісьменніка. Свята, пра якое мала хто ведае, на жаль. Аднак у нашых чытачоў ёсць асаблівая нагода святкаваць: днямі пісьменніку Віктару Казько, вядучаму конкурсу апавяданняў «Звязды», была прысуджана беларуская пісьменніцкая прэмія «Гліняны Вялес». З чым мы яго і віншуем, асабліва таму, што...**

***— У нас у Беларусі літаратурных прэмій няшмат...***

— Трэба сказаць, што мы сапраўды не багатыя на адзнакі літаратурнай творчасці, і гэта сведчыць у некаторай ступені пра стаўленне да культуры ўвогуле, якая, на жаль, не з'яўляецца ў свядомасці людзей прыярытэтным накірункам. І нас немагчыма раўняць нават з Расіяй, дзе літаратурных прэмій і адзнак за творчасць шмат. Мала таго, лепшыя расійскія пісьменнікі могуць жыць на тыя прэміі, ды і акрамя іх там шмат фондаў, накіраваных на падтрымку літаратурнай творчасці. У нас гэта прэмія сімвалічная ў матэрыяльным плане і хутчэй маральная.

***— Напэўна, прэмія «Гліняны Вялес» была задумана перш за ўсё дзеля таго, каб папулярызаваць нашых айчынных пісьменнікаў, прыцягнуць да іх увагу чытача.***

— Вядома, у сітуацыі, калі ў нас людзі не ведаюць сваіх сучасных пісьменнікаў, не адчуваюць патрэбы ў беларускім слове, гэта можа паўплываць. Каб не забыцца, што пісьменнік — гэта не выпадковы чалавек, які паціху нешта піша. Ён жа нешта робіць для гэтага грамадства, нешта вызначае ў ім. І не толькі. Таму важнасць літаратурнай прэміі ў тым, што яна дае прызнанне сярод саміх сябе. А яно дае магчымасць хоць бы ў сваім асяродку адчуць самога сябе самім сабой. Раней дзеля таго, каб у пісьменніку жыло вось гэтае пачуццё, праводзіліся нават конкурсы, скіраваныя на падтрымку творчасці і інтэлектуальнай працы. А ў нас цяпер больш папулярныя конкурсы сярод мадэльераў ці цырульнікаў, чым сярод пісьменнікаў... На гэта хапае і грошай, і ўвагі, і падтрымкі, і рэзанансу. Мне здаецца, гэта ідзе яшчэ ад савецкага часу, калі гандлёвы работнік ці цырульнік значыў больш за ўсякую культуру.

***— У савецкі час было, зразумела, рознае, але пры гэтым аўтарытэт пісьменніка ў грамадстве быў высокі, слова пісьменніка цанілася.***

— Некалі Стэйнбеку задалі пытанне, што такое для тых жа амерыканцаў пісьменнік і якая яго вага ў грамадстве? Ён разгубіўся нават: якая вага? Якое месца?.. Недзе побач з клоўнам, акрабатам... Аднак інтэлектуальная праца вызначае ўзровень грамадства. А ў нас тым больш — традыцыі пісьменства тысячагадовыя. Як на гэта заплюшчыць вочы? У нас моцныя традыцыі высокага пісьменства. І менавіта таму трэба адзначаць творцаў па іх працы, па майстэрстве.

***— Ваш твор «Бунт незапатрабаванага праху» называюць складаным, цяжкім.***

— Хто кажа складаны, хто цяжкі... Але часам чытачы гавораць такія словы, што мне няёмка нават паўтараць адзнаку, якую яны даюць майму твору. Я баюся такіх адзнак, мне неяк няёмка. Я дзетдомавец, ведаю, напрыклад, што трэба рабіць, калі мне даюць у морду. А калі мяне пачынаюць гладзіць па галаве, тут я ніякавею. Ды што казаць, калі ў нас з'явілася столькі прэтэндэнтаў... на Нобеля... У свой час Янка Брыль казаў: «За кім тут займаць чаргу?..»

***— Аднак вы напісалі твор, падчас чытання якога чалавеку трэба далучаць душу, гэта не бестселер. На якіх чытачоў вы разлічваеце?***

— Гэта самае складанае пытанне для мяне, таму што перш-наперш, калі я пішу, то разлічваю толькі на самога сябе. Цікава мне гэта пісаць, цікава мне пра гэта гаварыць ці не? А калі я пачну разлічваць на некага іншага, то міжволі буду падрабляцца пад яго густ, пад яго ўзровень, што для пісьменніка смяротна. Увогуле для творчага чалавека. Хоць цяпер і стала так, што ў нас усё камерцыйнае, усё на продаж, але падрабляцца — значыць перастаць быць пісьменнікам па сутнасці. Гэта даўняя пазіцыя: калі арыентавацца на некага — значыць, хлусіць самому сабе.

***— Але ў пісьменніка павінен быць чытач.***

— Калі пісьменнік цікавы сам сабе, то ў яго ёсць і чытач. У яго ёсць нешта за душой такое, што патрэбна чытачу, што ён можа давесці і закрануць чалавека. Але перш чым узяць за душу чытача, павінен у сабе знайсці нерв і ісці за сваёй думкай. А без думкі пісаць — графаманства.

***— Сёння Міжнародны дзень пісьменніка. Ці можа ў нашай краіне быць святам для ўсіх Дзень пісьменніка?***

— Я ўпершыню пра гэта чую. Але калі меркаваць па той ролі, якую адыгрывае пісьменнік у свядомасці нашых людзей, то гэта фарысейства — святкаваць гэты дзень. Калі ў нас будзе сваё свята, калі мы сваё слова шанаваць будзем, якое гучыць сёння? У беларускай літаратуры чалавеку можна знайсці ўсё, калі не ленавацца, яна ішла на ўзроўні. Я узгадваю словы Ніла Гілевіча: «Калі ўсім літаратурам мецы аднаго Янку Брыля, то гэтага б хапіла, каб лічыць любой краіне, што ў яе ёсць літаратура».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Браты Клічко і Аляксандр Усцінаў выходзяць з «чужога» прамоўтарскага бізнэсу

**20 сакавіка на стадыёне Esprit Arena Уладзімір Клічко будзе адстойваць свае чэмпіёнскія паясы, а мінчук Усцінаў правядзе важны рэйтынгавы двубой. Абодва баксёры днямі сталі героямі інфармацыйных сюжэтаў у спартовых і эканамічных СМІ.**




Справа не толькі ў тытульным двубоі 20 сакавіка, які пройдзе ў нямецкім Дзюсельдорфе і будзе трансляваццa на ўвесь свет.

Стала вядома пра тое, што Віталь Клічко выйшаў з ліку сузаснавальнікаў прамоўтарскай кампаніі K2East Promotions, якая займалася раскруткай 19 вядомых баксёраў з Украіны, Беларусі, Расіі, Харватыі і Грузіі. Кампанія, дзякуючы братам Клічко, здабыла сусветнае імя. Кар'ерай мінчука Аляксандра Усцінава таксама займаліся ў K2East Promotions.

Што цяпер будзе з Аляксандрам, які вось-вось павінен падысці да двубоя за магчымасць узяць удзел у паядынку за сусветны тытул?

*— Два тыдні таму Клічко сапраўды нечакана выйшаў з ліку сузаснавальнікаў кампаніі K2 East Promotion, для генеральнага дырэктара Вадзіма Бухкалава гэта стала шокам,* — распавядаюць «Звяздзе» ў прэс-цэнтры прамоўтарскай кампаніі. *— Нібыта Віталь Клічко збіраецца заснаваць уласную прамоўтарскую кампанію, але з нашых байцоў на кантракце ў Клічко застанецца толькі адзін баксёр — беларус Аляксандр Усцінаў.*

Выходзіць, што браты Клічко, якія сёння кантралююць суперцяжкую вагу ў сусветным боксе, працягнуць займацца Усцінавым і, больш за тое, зробяць на яго стаўку.

Такім чынам, 20 сакавіка на стадыёне Esprit Arena ў Дзюсельдорфе, у якім змяшчаецца 51 тысяча чалавек, Уладзімір Клічко будзе абараняць свае сусветныя тытулы IBF і WBO ў паядынку з Эдзі Чэмберсам, а Аляксандр Усцінаў правядзе важны рэйтынгавы двубой.

— Я нават не ведаю прозвішча свайго суперніка, скажу толькі, што хутчэй за ўсё гэта будзе немец, — зрабіў здагадку Аляксандр, калі мы днямі наведалі яго трэніроўку ў сталічным спарткомплексе «Алімп». — Двубой будзе рэйтынгавы, таму што тытул чэмпіёна Еўропы ў версіі ЕВА я ўжо абараніў. Цяпер думкі пра прэтэндэнцкі паядынак, які дазволіць пазмагацца за сусветны тытул WBA, якім сёння валодае брытанец Дэвід Хэй, што перамог Мікалая Валуева.

**— Калі ж нам чакаць прэтэндэнцкага паядынку?**

— Трэба яшчэ на некалькі пазіцый падняцца ў рэйтынгу. На думку тых жа брытанскіх журналістаў, з Дэвідам Хэем мы можам сустрэцца ў гэтым годзе. Калі я ў апошнім двубоі адзінагалосна перамог Монці Барэта (адбылося гэта ў Швейцарыі), то прыязджала англійскае тэлебачанне. Журналісты таму і здымалі пра мяне сюжэт, што лічаць наш з Хэем двубой верагодным.

Сёння Аляксандр Усцінаў займае шостае месца ў сусветным рэйтынгу WBA. Хутчэй за ўсё, у Дзюсельдорфе мінчук сустрэнецца з немцам Рэнэ Дэтвайлерам.

Нагадаем, што замежныя журналісты называюць нашага Аляксандра «Вялікай белай надзеяй сусветнага бокса». Прэсу падкупляе лёс нашага байца: пачаў прафесійна займацца боксам толькі ў 25-гадовым узросце, калі многія ўжо завяршаюць спартовую кар'еру. Рост Усцінава — 200 сантыметраў, вага — каля 140 кг. Пры гэтым мінскі асілак рухаецца, як баксёр-сярэдневагавік.

Верагодна, што чарговы паядынак Аляксандра пакажуць і па беларускім тэлебачанні, гэта пытанне будзе вырашацца неўзабаве. «Звязда» будзе паведамляць пра двубоі з удзелам Уладзіміра Клічко і Аляксандра Усцінава.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## АГРЭСІЯ, «АБГРУНТАВАНАЯ» АЛКАГОЛЕМ

**Цягаючы халодную зброю ў кішэні, 19-гадовы жыхар Мінскай вобласці скарыстаўся ёй у сталіцы без дай прычыны: накінуўся на кіроўцу машыны, якая яму не спадабалася, са словамі «Мне канец і табе канец!»**

На шчасце, паводле звестак прэс-афіцэра Цэнтральнага РУУС Кацярыны Лісоўскай, пацярпелы паспеў перахапіць удар і атрымаў толькі нязначныя раненні пальца. Адметна, што зламыснік не змог ніяк патлумачыць сваёй агрэсіі. А супрацоўнікі міліцыі напачатку неадэкватныя паводзіны затрыманага патрымачылі з тым, што той быў нецвярозы. Аднак, калі ўстанавілі асобу злачынцы, высветлілася некалькі адметных дэталяў. У прыватнасці, выявілася, што юнак ужо меў справу з урачамі-нарколагамі, якія, улічыўшы яго псіхафізічныя асаблівасці, адназначна забаранілі яму ўжываць спіртное. Між іншым, і да гэтага затрыманы меў непаразуменні з законам: ён прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за наўмыснае нанясенне цялеснага пашкоджання, прычым менавіта з прымяненнем нажа. За злачынства ён быў прыгавораны да чатырох гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання на два гады. Відаць, «навука» — не для невука, якому «свеціць» больш працяглы тэрмін турэмных «універсітэтаў».

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ОАО «МИНСКТОРГМАШ»

**сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 23 марта 2010 г. в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 22, бухгалтерия Общества.**

**Повестка дня:**

- Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 г.
- Отчет ревизора.
- Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках Общества.
- О выплате дивидендов за 2009 г.
- О проекте распределения чистой прибыли на 2010 г.
- Об избрании членов Наблюдательного совета и ревизора.
- Об установлении вознаграждения для членов Наблюдательного совета и ревизора.

Регистрация начинается в 14.00.

При себе иметь паспорт.

УНП 100103798

**Наблюдательный совет.**

# «ЗНАЙСЦІ СКАРБЫ? ЛЁГКА!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



## Шукальнікі скарбаў

Сваю дзейнасць скарбашукальнікі не рэкламуюць і стараюцца трымацца ў цені. Але сярод тых, з кім мне давялося сустракацца, існуюць дзве катэгорыі. Да першай можна аднесці людзей, у якіх не склалася жыццё — распалася сям'я, няма працы і рубля ў кішэні. Няўдачнікі-летуценнікі, якія спадзяюцца, што шчасце ім усміхнецца збаночкам з залатымі манетамі. Сярод гэтай групы ёсць людзі немаладыя — ужо і да пенсіі рукой падаць, а ўсё ходзяць з металашукальнікам, быццам сапёры па мінным полі.

А другую катэгорыю складаюць людзі, якія цвёрда стаяць на зямлі — яны ўладкаваліся ў жыцці. Прадпрымальнік, адстаўнік, чалавек, які займае ў грамадстве нейкую нішу, у вольны час шукае скарб. Што яго штурхае на гэта? Напэўна, азарт, вера ў сваю зорку — а раптам...

На ўсіх скарбаў не хопіць, але ж кожны думае, што яго скарб дзесьці ляжыць, усяго на штых ад паверхні.

## Манеты, пярсцёнкі, гузікі...

Знаёмы паказваў адкапаныя трафеі, і калі я на нешта звяртаў увагу, называў кошт. Невялікая срэбная манетка часоў Вялікага Княства (1549 г.) мела цану ў 20 тысяч. Цана не вельмі, але якая каштоўнасць той манеты? Былі коштам у 15 долараў, і ў пяць.

Алег хацеў нешта прадаць, ды і раз-пораз паўтараў, што з продажу ён і жыве.

Усе старадаўнія рэчы выклікаюць цікавасць — ёсць у іх прыцягальная сіла. За кожнай такой рэччу стаіць чалавек, якога аддзяляюць ад нас стагоддзі.

Вось з дзясятак заручальных пярсцёнкаў — медныя і бронзавыя, якія насілі небагатыя людзі. На чыіх пальцах былі гэтыя пярсцёнкі, хто іх згубіў?

У невялікай скрыначцы ляжаць гузікі. Рознакаліберныя, з арламі і вензелямі, а то і зусім чыстыя, яны некалі ўпрыгожвалі мундзіры, камзолы і ліўрэі. А адзін гузік-гарошына, са слоў Алега, быццам бы адносіцца да перыяду Кіеўскай Русі.

Металічныя элементы збруі, розныя спражачкі, напарсткі... і вялікая колькасць медных манет. Безумоўна, усё гэта мае культурна-гістарычную каштоўнасць, але багатым на гэтых рэчах не станеш.

*— На балконе ў мяне стаяць два вядры з сякерамі, падковамі і розным кавальствам,* — кажа гаспадар, але мяне цікавіць іншае.

— А дзе золата? Няўжо толькі гэтая бронзавая драбяза?

*— Мой калега знайшоў залаты пярсцёнак,* — і Алег зноў уключыў камп'ютар.

На здымку быў тоненькі жаночы пярсцёнак на некалькі грамаў. Небагата.

— А месца для пошуку як вызначаецца?

*— На Беларусі ўжо ўсё капана і перакапана, бо кожны сёння можа купіць прыбор і шукаць наўскід. Я ж выбіраю месца па старых мапах. Напрыклад, пазначана , што некалі на гэтым месцы стаяў фальварак ці маёнтак, а сёння тут чыстае поле, вось і даводзіцца вызначаць месца па камянях з падмурка ці іншых прыкметах і затым брацца за металашукальнік.*

— Якія мясціны найбольш прываблівaюць шукальнікаў?

*— Найперш старадаўнія гарады і іх наваколле. Летась многія з гэтых рэчаў удалася знайсці пад Клецкам і Нясвіжам.*

— Канкурэнты даймаюць?

*— Я працую разам з адным сур'ёзным мужчынам. У яго ёсць аўтамашына, то разам і ездзім. У палявых умовах найлепш працаваць з напарнікам, бо, здараецца, розныя людзі падыходзяць і цікавяцца. Што да канкурэнтаў, то тут адносіны, як правіла, нейтральныя. Мы ведаем адзін аднаго ў твар, бывае, сустракаемся на нейкіх тусоўках, і тут асаблівых праблем няма. Чужакоў у нас не любяць.*

Я прапанаваў Алегу сфатаграфавацца, але ён быў катэгарычным: «Ні ў якім разе, і каб маё прозвішча не фігуравала».

Няхай так і будзе.

І ўсё ж здараецца, што ўдача выпадае. Вось што расказаў знаёмы шукальнік скарбаў з-пад Мінска.

*— Гадоў васямнаццаць таму ў нашым горадзе толькі ў мяне быў металашукальнік. Аднойчы двое мужчын прапанавалі мне здзелку. Яны пакажуць месца, якое трэба абследаваць, і калі там нешта будзе знойдзена, то я атрымаю 10 працэнтаў ад кошту той рэчы. Уважліва, метр за метрам, я прашчупаў тэрыторыю і знайшоў залатую пласціну з каштоўнымі камянямі. За гэта я атрымаў 5 тысяч долараў і мы разышліся — усе былі задаволеныя.*

Але багатым знаёмы не стаў. На тыя долары купіў аднапакаёўку (тады цана на кватэры была нізкая) і зноў стаў бедным. Ва ўсякім разе пры апошняй сустрэчы прасіў грошай на электрычку.

Толькі не ўсе шукальнікі настроены на скарбы. Вось прадпрымальнік з Ляхавічаў марыць знайсці склеп з віном, які, на яго думку, быў падчас Першай сусветнай вайны непадалёк ад райцэнтра, на нямецкіх пазіцыях. У гэтых мясцінах лінія фронту была трывалай на працягу некалькі гадоў, таму прадпрымальнік ўпэўнены, што на складах з рознай амуніцыяй захоўвалася і віно, завезенае з Еўропы пад Ляхавічы.

Я не ведаю, ці ёсць тут праўда, але гэтую тэму мы абмяркоўвалі і нават мелі намер зрабіць сумесны выезд на былую лінію фронту.

Не атрымалася, а можа, і без мяне ўсё адбылося.

## Скарб — як латарэя

Знайсці багаты скарб — вялікая ўдача. Многія шукаюць каштоўнасці ў зямлі ці ў сценах будынкаў. І яны там могуць быць, калі ўладальнікі таго золата ўсё прадумалі і ў іх быў час, каб падабраць месца, выбіць у сцяне нішу і замураваць яе. Але падчас раптоўнай навалы ці нападу гаспадар мог сабраць усё каштоўнае ў анучу ці бляшанку ды кінуць у калодзеж ці нават прыбіральню — надзейнае месца, дарэчы. І нікому ў галаву не прыйдзе, што там можа быць скарб.

Каб знайсці скарб, адны прыкладаюць вялікія намаганні. Успомнім золата Шлімана. Колькі ў чалавека было ўпартасці, упэўненасці і які неабходна было правесці аб'ём работы, каб даказаць, што Троя існавала. А іншым золата само ідзе ў рукі.

У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі ёсць скарб, які выпадкова знайшлі падчас будоўлі. Масіўныя залатыя ланцужкі даўжынёю ў паўтара метра, залаты кішэнны гадзіннік і іншыя ювелірныя вырабы, відавочна, належалі багатай яўрэйскай сям'і, але з прыходам нацыстаў гэтыя каштоўнасці давялося схаваць.

Вялікую колькасць залатых манет знайшлі дзве жанчыны з Баранавічаў — падчышчалі траншэю і адкапалі. Шумная была справа. Тыя манеты жанчыны падзялілі між сабой.

Адна з іх не была замужам і з палюбоўнікамі разлічвалася манетамі. Але шчасце тое не доўга цягнулася, бо ў ролі кавалера выступіў аператыўнік. Жанчыну затрымалі і яна расказала, як было. Але ж напарніца па скарбе ўсё адмаўляла — золата не аддала і была асуджана. Вярнулася ў сям'ю, здаецца, праз шэсць гадоў.

Прыязджаў у Баранавічы і адзін паляк, які заявіў уладам, што ведае, дзе яго былы гаспадар схаваў багаты скарб. Багата тады зямлі перавярнулі, амаль у цэнтры горада, але нічога не знайшлі.

Пошук скарбу мае падабенства да гульні ў латарэю. Адзін купляе білеты ўсё жыццё і нічога не выйграе, а другі купіў і... А яшчэ не трэба забываць, што ўсе скарбы, дзе б яны ні былі схаваныя, належаць дзяржаве і кожны, хто знайшоў скарб, абавязаны... Але ж дзяліцца золатам і срэбрам...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**9 апреля 2010 г. в 12.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома:**

УНП 600038472.

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Колосовского, 7, 624250100001004202 | 0,0946 | Водоснабжение, электроснабжение газоснабжение, канализация | 5000000 | 490000 |
| 2. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Колосовского, 9, 624250100001004201 | 0,0952 | | 5000000 | 490000 |
| 3. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Колосовского, 11, 624250100001004200 | 0,0957 | | 5000000 | 490000 |
| 4. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Колосовского, 11 А, 624250100001004199 | 0,0963 | | 5000000 | 490000 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Условия для победителя аукциона: внесение в течение 10 рабочих дней со дня принятия Несвижским райисполкомом решения о предоставлении земельного участка платы за земельный участок, возмещение расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; осуществление в двухмесячный срок, после принятия решения о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятия (освоения) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации прав на него.

## НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**9 апреля 2010 г. в 12.30 проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка:**

УНП 600038472.

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Советская, назначение – для установки и обслуживания торгового павильона, кадастровый номер 624250100001003979, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 0,0040 | 51 | 947873 | 90000 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Участник, ставший победителям аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации; не позднее 2 рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона, возмещения расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации заключить договор аренды земельного участка.

Иные обязанности победителя аукциона и порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Задаток перечисляется в срок по 8 апреля 2010 г. на р\с 3642200070020 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж, УНП 600038472, получатель платежа – Несвижский районный исполнительный комитет.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1, к. 312, тел. (8 01770) 54865 (моб. 6152111). **Последний день подачи заявок – 8 апреля 2010 г. до 17.00.**

